9*

**1. Адзначце словы з падвоенымі зычнымі**
А) бязлюддзе
Б) дрэнна
В) аддае
Г) раззлавацца
Д) сталлю

**2. Адзначце словы, якія пішуцца з вялікай літары**
А) (П,п) іфагорава тэарэма
Б) (Г,г) анаровая грамата
В) (Б,б) еларускі вакзал у Маскве
Г) Дзень (Ч,ч) ыгуначніка
Д) Турава – (П,п) інскае княства

**3. Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок**
А) вучэбна_ наглядны дапаможнік
Б) старажытна_ беларуская мова
В) віцэ_ чэмпіён
Г) урач_ хірург
Д) псеўда_ мастацтва

**4. Адзначце правільна запісаныя дзеепрыметнікі**
А) сагнуты
Б) адрэгуляваны
В) запыляны
Г) невысвятлены
Д) прынесенны

**5. Адзначце сказы, у якіх часціца не (ня) пішацца разам**
А) Мне пачало (не) добрыцца.
Б) На яшчэ (не) ўзараным полі стаялі стагі саломы.
В) Густы туман, (не) разагнаны ветрам, слаўся па зямлі белай завесай.
Г) Убачыць барсука зусім (не) лёгка.
Д) Вучань адказваў (не) хвалюючыся.

**6. Адзначце складаныя словы**
А) аднабокі
Б) васемнаццаць
В) вінаград
Г) аўторак
Д) дапатопны

**7. Адзначце словы, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам**
А) прыгарад
Б) паціху
В) здымак
Г) забяліць
Д) прысвоіць

**8. Адзначце рознаспрагальныя дзеясловы**
А) віць
Б) пачынаць
В) аддаць
Г) пад'есці
Д) прыбегчы

**9. Адзначце правільны варыянт**
А) кпіць з аднакласнікаў
Б) чытаць больш уважлівей
В) хварэць на дыфтэрыю
Г) хадзіць па грыбы
Д) эфектная стратэгія

**10. Адзначце словы, якія адрозніваюцца лексічным значэннем**
А) чысты
Б) з чыстай
В) чысціня
Г) чысціць
Д) падчысціць

**11. Адзначце рады слоў, у якіх запісаны антонімы**
А) рэзкі рух – плаўны рух
Б) рэзкае святло – слабое святло
В) рэзкае павышэнне тэмпературы – паступовае павышэнне тэмпературы
Г) рэзкі голас – мілагучны голас
Д) рэзкі чалавек – вясёлы чалавек

**12. Адзначце сказы з аднароднымі азначэннямі**
А) Цёплая летняя ноч павольна апускалася на зямлю.
Б) Дзьмуў едкі густы парывісты вецер.

В) Над далёкімі лясамі звісала тонкая блакітная смуга.
Г) Плыве над верасам хваёвы душны пах.
Д) Мяккія ласкавыя гукі мелодыі напоўнілі пакой.

**13. Адзначце складаныя сказы**

А) Вада выйшла з берагоў і затапіла не толькі агароды, але і двары.
Б) Мядзведзіца пераварочвала старыя, трухлявыя калоды, заваленыя бураломам, і ў чорнай вільготнай глебе знаходзіла мноства лічынак, чарвей і слімакоў.
В) Сонца садзілася на хвалі велізарным кругам, а сутыкнуўшыся з вадою, увачавідкі змянілася – стала падобным на ўпрыгожаны чырвонымі сцягамі параход.
Г) Яшчэ стракаталі конікі, там-сям адчуваўся пах завялых траў.
Д) Сцёпка доўга стаяў, любуючыся горадам, і нейкае новае адчуванне калыхала яго, прыцягвала да гэтага горада і ў той жа час палохала і непакоіла.

**14. Адзначце сказы, у якіх дапушчана памылка ў каардынацыі дзейніка і выказніка**

А) Большасць сялян насіла простыя паясы, з лёну ды воўны.
Б) Некаторыя майстры прыўнеслі ў малюнак паясоў родныя ўзоры.
В) Костусь з Алесем затрымаліся на ўзмежку ў жыце.
Г) Толькі тры экзамены засталіся.
Д) На камбайне рабіў Карней з памочнікам – сваім аднакласнікам.

**15.Колькі і якіх знакаў прыпынку павінна быць у сказе? Адзначце правільны адказ**

І сёння бачыцца чысціць ён рыбу ўжо запозна поўня высока і перасейваецца на лусцэ як на сіце яе мяккае жытнёвае святло.
А) 5 косак, 1 двукроп'е
Б) 5 косак, 1 двукроп'е, 1 працяжнік
В) 6 косак
Г) 4 коскі, 1 двукроп'е